пожертвования – символ щедрости умершего, и др. Чтение данных практически невозможно. Сложности возникли в связи с тем, что на памятниках изучаемого периода надписи сделаны на языке идиш, но буквами иврита. Удалось прочесть надписи на двух могильных плитах: «Об этом человеке никто никогда не мог сказать плохого слова. Скорбящие тесть, теща и жена предали земле его. Имя его Хинин» и «Эта женщина долгие годы учила детей учиться…». Информация с сохранившихся памятников была списана, обработана и систематизирована.

Многие памятники на кладбище повалены. Часть надгробий уничтожена. По периметру кладбище обнесено деревянной оградой. На настоящий момент оно находится в фактически бесхозном состоянии, зарастает травой и кустарником.

Таким образом, в результате проведенного исследования были изучены 18 захоронений. О Старобинском еврейском некрополе известно очень немного и практически ничего не написано. Проблема ухода за местами захоронений в Старобине продолжает оставаться актуальной. Поселок теряет свой исторический облик, поскольку любое древнее захоронение является историческим памятником. Изучение состояния памятников еврейского некрополя позволило определить проблемы сохранности некоторых из них, привлечь внимание общественности.

УДК 81’373.21(476.6)

Навуч. С. П. Скібіцкі
Навук. кір. І. А. Карпічэнка, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства
(ДУА «Вучэбна-педагагічны комплекс Ханявіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа»)

## З ГІСТОРЫІ НАЗВАЎ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ХАНЯВІЦКАГА СЕЛЬСКАГА САВЕТА

Вывучэнне тапонімаў дае магчымасць аднавіць старажытную мову, тэрыторыю засяленне і этнагенез асобных народаў, даведацца пра гісторыю і культуру народа. Адраджаючы гісторыка-культурную пераемнасць у тапаніміі, мы вяртаем культурныя каштоўнасці сваёй нацыі. Гэта і абумоўлівае актуальнасць дадзенай тэмы.

Практычная значнасць гісторыі геаграфічных назваў населеных пунктаў накіравана на паглыбленне ведаў па гісторыі малой радзімы, тапаніміцы, для выкарыстання на ўроках гісторыі, літаратуры, факультатыўных занятках і занятках у аб’яднаннях па інтарэсах краязнаўчага профілю.

Аб’ект даследавання – геаграфічныя і прыродныя абъекты Ханявіцкага сельскага савета.

Прадмет даследавання – значэнне, утварэнне і паходжанне тапонімаў.

Гіпотэза даследавання: калі даследаваць асаблівасці паходжання геаграфічных назваў мясцовасці, то можна абгрунтаваць іх назвы.

Мэта работы: даследаванне значэння і паходжання назваў населеных пунктаў і прыродных аб’ектаў Ханявіцкага сельскага Савета.

Задачы:

− даследаваць тапаніміку роднага краю: айконімы (назвы населенных пунктаў), гідронімы, гадонімы (назвы вуліц), гідронімы (назвы водных аб’ектаў), мікратапонімы;

– правесці класіфікацыю тапонімаў Ханявіцкага сельскага Савета Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці і скласці слоўнік «Тапонімы Ханявіцкага сельскага савета Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці».

Былі выкарыстаны такія метады даследавання, як сацыялагічнае анкетаванне, аналіз, выкарыстаны апісальны метад.

У рабоце выяўлена паходжанне назваў населеных пунктаў Ханявіцкага сельскага Савета, праведзена іх класіфікацыя, устаноўлены заканамернасці ўзнікнення назваў, паказана сувязь тапонімаў з гістарычным мінулым Беларусі, з асаблівасцямі геаграфічнага становішча, гаспадарчай і духоўнай дзейнасцю нашага народа, з яго самабытнай мовай і культурай. Для ўстанаўлення паходжання назваў былі выкарыстаны шматлікія крыніцы: геаграфічныя, гістарычныя, этнаграфічныя, фальклорныя, энцыклапедычныя, літаратурныя творы і сучасная перыёдыка, вусныя сведчанні сучасных старажылаў і ўласныя назіранні.

Такім чынам, аналіз сабранага фактычнага матэрыялу сведчыць аб тым, што, назвы многіх тапонімаў звязаны з рэльефам, сведчаць пра грунтова-глебавыя ўмовы мясцовасці: Вострыя горы, Карыціна, Горы . Паводле назваў некаторых вёсак можна меркаваць пра флору і фаўну дадзенай мясцовасці: Белы мох, Белы гай, Лубянка, Верасоўка, Залескі Бор, Каліноўшчына,Сабалькі. Пэўныя назвы звязаны з працоўнай дзейнасцю і з іх старажытнымі промысламі (в. Рудня, в. Лубянка, в. Лідзяны). Шмат тапонімаў утворана ад ўласных імёнаў, прозвішчаў, мянушак людзей. Гэта характэрна і для нашай мясцовасці, так як большасць існуючых назваў узнікла менавіта так. З усіх даследаваных аб’ектаў пераважная большасць назваў утворана ад уласных імён (вёскі Дашкавічы, Лаўрынавічы, Савані, Куклічы, Алісеевічы, Мінічы і інш.). Некаторыя мікратапонімы адлюстроўваюць знешнія асаблівасці паселішча (колер, велічыню) (в.Падчарнейкі), звязаны сваім паходжаннем з воднымі аб’ектамі (вадаём Ставок, рака Зяльвянка).

Такім чынам, зроблены тапанімічны аналіз пацвярджае прапанаваную гіпотэзу.

Сабраны матэрыял зафіксаваны ў слоўніку «Тапонімы Ханявіцкага сельскага Савета Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці», які складаецца з 91 тапоніма.

УДК 94"1569/1795"

Навуч. В. Р. Стаброўская
Навук. кір. К. В. Маціеўская, настаўнік гісторыі
(ДУА "Каладзішчанская сярэдняя школа")

## ВАЕННАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У МАСКОЎСКУЮ ДЗЯРЖАВУ

На канец XVI – пачатак XVII стст. прыпадае дынастычны крызіс у Маскоўскай дзяржаве, які ў гістарыяграфіі атрымаў назву "Смута"(1598-1613 гг.). [1, с. 93]. Улічваючы той факт, што ўсё папярэдняе стагоддзе суправаджалася бесперапыннымі войнамі паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, у выніку якіх ВКЛ страціла значныя тэрыторыі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза не мог упусціць магчымасці выкарыстаць у сваіх інтарэсах цяжкае становішча суседняй краіны і вярнуць страчаныя раней землі [2, с. 116].

Падставай для ўмяшання ва ўнутрыпалітычныя справы Масквы паслужыла з'яўленне на тэрыторыі ВКЛ самазванца, які выдаваў сябе за ўратаванага царэвіча Дзмітрыя Іванавіча, загінуўшага яшчэ ў 1591 г. пры невядомых абставінах.

Для заняцця прастола Маскоўскай дзяржавы Лжэдзмітрый I вырашыў заручыцца падтрымкай каталіцкіх колаў Рэчы Паспалітай і непасрэдна з каралём Жыгімонтам III. У якасці платы за дапамогу ў барацьбе за прастол самазванец абавязваўся перадаць Рэчы Паспалітай Смаленск і Северскую зямлю і спрыяць распаўсюджанню каталіцтва на тэрыторыі Расійскага царства[4, с.54].

У кастрычніку 1604 г. войска Лжэдзмітрыя I, якое складалася з дзвух тысяч наёмнікаў, перайшло межы Расіі. Нягледзячы на слабасць войска самазванцу, удалося дасягнуць пэўных поспехаў. Што было абумоўлена шырокай падтрымкай сярод расійскага насельніцтва ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу. Распаўсюджаныя ў народзе манархічныя ілюзіі спрыялі з'яўленню чутак аб выратаванні царэвіча Дзмітрыя, якога з лёгкасцю атаясамлівалі з самазванцам. На яго бок перайшлі сяляне, якія пакутавалі ад феадальнага гнёту, казакі, незадаволеныя наступленнем дзяржавы на паўднёвыя ўскраіны. У выніку, без супраціўлення былі ўзяты гарады Чарнігаў, Пуціўль, Рыльск і Сеўск.